Die Jugend wanderte in den Bergen. У англійскай мове у гэтым значэнні ужываецца слова travel: My friend is fond of travelling.

З другога боку, семантычны варыянт англійскага 'wander – т р ы з н і ц ь , в я р з ц і (She wandered in her mind) адсутнічае як у беларускай, так і у нямецкай мовах.

Выкарыстанне на занятках па замежнай мове лексічных аналагізмау прадстауляе вялікую цікавасць для студэнтау, развівае іх пазнавальную і даследчую здольнасці, спрыяе разуменню культуры, рэалій той краіны, мову якой яны вывучаюць.

## СЛУЦКІ ЗБРОЙНЫ ЧЫН 1920 ГОДА

А.Грыцкевіч

Слуцкае паустанне 1920 г. адбылося у самым канцы расійска-польскай вайны 1919–1920 гг. Яму папярэднічалі контрнаступ польскіх войск пасля разгрому чырвонай арміі пад Варшавай і Львовам і захоп польскімі войскамі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. 12 кастрычніка 1920 г. быу падпісаны дагавор аб перамір'і і прэлімінарных (папярэдніх) умовах міру. Слуцк і Слуцкі павет былі часова занятыя польскімі войскамі, якія працягвалі наступ за лінію мяжы да 18 кастрычніка.

Слуцк і Слуцкі павет былі асяродкамі дзейнасці беларускага нацыянальнага руху. Актыуным было і беларускае сялянства, якое пасля нямецкай і польскай акупацыі яшчэ не паспела прызвычаіцца да палітыкі ваеннага камунізму, харчразверсткі з амаль поунай канфіскацыяй ураджаю і жывелы. Асноуным чыннікам Слуцкага паустання было беларускае сялянства, якое бараніла не толькі свае сацыяльнае становішча, але выступала і за незалежнасць сваей дзяржавы – Беларускай Народнай Рэспублікі. А найбольш актыуным чыннікам, які падняу сялянства на барацьбу за нацыянальную незалежнасць і супраць сацыяльнага прыгнету дыктатуры пралетарыяту, была свядомая беларуская нацыянальная інтэлігенцыя.

Польскія вайсковыя улады толькі у лістападзе 1920 г., ужо перад адыходам за лінію мяжы з акупаванай тэрыторыі, перадалі цывільную уладу у Слуцку Беларускаму нацыянальнаму камітэту. У



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вёсках і валасцях Случчыны дэмакратычным шляхам выбраны адпаведныя Беларускія нацыянальныя камітэты, якія замянілі прызначаных польскімі уладамі войтаў у валасцях і солтысаў у вёсках.

Прадстаўнікі партыі беларускіх эсэраў, якія мелі перавагу у Беларускім нацыянальным камітэце у Слуцку, у адрозненне ад групоўкі, схільнай да супрацоўніцтва з польскімі уладамі, займалі незалежніцкія пазіцыі, як у дачыненні да Польшчы, так і да Расіі. Яны вырашылі склікаць з'езд Случчыны у перабажнай большасці з сялян, каб устанавіць у павеце легальную уладу Беларускай Народнай Рэспублікі.

Першы беларускі з'езд Случчыны адбыўся 14-15 лістапада 1920 г. у Слуцку у вялікай зале дома Э.Вайніловіча, фундатара Чырвонага касцёлу у Менску. Кіравалі з'ездам беларускія эсэры. 14 лістапада сялянскі з'езд Случчыны прыняў рэзалюцыю, у якой вітаў Найвышэйшую раду Беларускай Народнай Рэспублікі і заявіў катэгарычны пратэст супраць савецкай улады на Беларусі "як чужацкай". Асноўным зместам гэтай рэзалюцыі было рашэнне падняць паўстанне "супраць акупацыі" за "незалежную Беларусь".

З'езд Случчыны выбраў Раду Случчыны Беларускай Народнай Рэспублікі, даверыў ей цывільную уладу і даручыў арганізацыю войска. У беларускай радзе Случчыны з 17 сяброў было 8 беларускіх эсэраў, да якіх прымыкалі спачуваючыя. Іх апанентамі былі прыхільнікі генерала С.Булах-Булаховіча. Пачалося фарміраванне войска і цывільных органаў нацыянальнай дзяржаўнай улады. 21 лістапада Слуцкая рада выдала дэкларацыю, заклікаючы сялянства на барацьбу за "незалежную Беларусь у яе этнаграфічных граніцах" і "за інтарэсы сялянства". За тры дні з добраахвотнікаў была сфарміравана 1-я Слуцкая брыгада стральцоў войск Беларускай Народнай Рэспублікі у складзе двух палкоў: 1-га Слуцкага і 2-га Грозаўскага.

А у гэты час польскія войскі павінны былі адыйсці за лінію мяжы, вызначаную прэлімінарным мірным дагаворам. 24 лістапада яны пакінулі Слуцк. 29 лістапада чырвоныя часці вайшлі на дэмаркацыйную лінію у 15 кіламетрах ад граніцы. Далей была з абодвух бакоў (на 15 км) нейтральная зона, да падпісання канчатковага мірнага дагавору.

Колькасны састаў Слуцкай брыгады, якая адыйшла у нейтраль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ную зону (штаб і Слуцкая рада былі размешчаны ў мястэчку Семежава), у канцы лістапада 1920 г., складаў 4 тысячы чалавек; потым пабольшыўся і разам з рэзервам усяго было 10 тысяч чалавек. Зброі на усіх не хапала. Спачатку было 500 вінтовак, што прынеслі паўстанцы, і 300 карабінаў, перададзеных польскімі уладамі. Але хутка выявілася, што гэтыя карабіны для баеў непрыдатныя: у іх наўтыска былі збіты мушкі і прыцэлы. Потым у брыгадзе было ўжо 2000 вінтовак і 10 кулямётаў, у тым за кошт трафеяў. Брыгада была пяхотнай. Такім чынам, за некалькі дзен было створана вайсковае аб'яднанне рэгулярных войск Беларускай Народнай Рэспублікі.

Баявыя дзеянні брыгады доўжыліся цэлы месяц - з 27 лістапада да 28 снежня 1920 г. Войскі Чырвонай арміі (са згоды польскіх улад) увесь час заходзілі на тэрыторыю нейтральнай зоны, нават на польскі бок. Некаторыя мястэчкі (Семежава, Вызна) і вескі пераходзілі з рук у рукі на некалькі разоў. Урэшце з-за перавагі чырвоных войск і недахопу зброі, боепрыпасаў і харчавання. Пасля пераходу праз раку Лань на тэрыторыю, кантралюемую польскімі войскамі, салдаты і афіцэры Слуцкай брыгады былі разброены і інтэрнаваны ў лагерах: спачатку ў раёне Сінякі, потым у Беластоку і Дарагуску. Яны былі вызваленыя польскімі уладамі толькі ў маі 1921 г., ужо пасля падпісання канчатковага мірнага дагавору паміж Савецкай Расіяй і Польшчай.

У акрэсе гістарычнага лесу Беларусі пачатку XX стагоддзя Слуцкі збройны чын адыграў значную ролю. Гэта быў парыятычны чын беларускага сялянства і інтэлігенцыі ў барацьбе за незалежнасць Беларусі ў яе этнічных межах, за самастойную дзяржаву з легальнай дэмакратычнай уладай. Ен быў накіраваны супраць ганебнага падзелу тэрыторыі Беларусі паміж Расіяй і Польшчай.

## НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ВАЙНЫ 1812 г. НА БЕЛАРУСІ

С.Крыуліна

Беларускі народ вельмі часта апынаўся уплецены у гушчыню многіх гістарычных падзей. Сярод іх - вайна 1812 года. Пытанне "Беларусь і вайна 1812 г." шматграннае, паколькі на Беларусі і